© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819-3625 № 8, 2007



Ірміна Матанітэ

# Старая палітычная эліта ў посткамуністычных парламентах (Эстонія, Латвія, Літва і Польшча)

*Abstract.*

У артыкуле даследуюцца трансфармацыі палітычных элітаў Эстоніі, Латвіі, Літвы і Польшчы на аснове аналізу парламенцкага корпуса 1990—2004 гадоў. Разглядаецца дынаміка прадстаўніцтва экс-камуністаў, экс-дысідэнтаў і раней палітычна неактыўных парламентараў, палітычныя і сацыяльна-дэмаграфічныя ўласцівасці гэтых групаў. Вынікі аналізу дэманструюць захаванне ў складзе дэмакратычных парламентаў значнай колькасці былых камуністаў. Пры гэтым агульнай тэндэнцыяй з'яўляецца змяншэнне прадстаўніцтва экс-камуністаў і дысідэнтаў, ва ўмовах імклівага росту колькасці раней палітычна незаангажаваных асобаў. Робіцца выснова пра залежнасць канфігурацыі парламенцкіх элітаў ад асаблівасцяў генезісу савецкай наменклатуры і Камуністычнай партыі ў прыбалтыйскіх краінах і Польшчы. Аўтар аспрэчвае «тэорыю змовы», паводле якой былыя дзеячы камуністычнага рэжыму адыгрываюць негатыўную (падрыўную) ролю ў дэмакратычных умовах.

*Ключавыя словы:* транзіталогія, посткамунізм, посткамуністычныя краіны, палітычная эліта, палітычная эліта Эстоніі, Латвіі, Літвы і Польшчы, парламенцкая эліта, экс-камуністы.

Гэты артыкул грунтуецца на некаторых гіпотэзах транзіталогіі і падкрэслівае рэвалюцыйны характар посткамуністычных зменаў. Аналіз уключае істотнае з акадэмічнага пункту гледжання даследаванне палітычных элітаў, адзначаючца іх посткамуністычная ўстойлівасць і ўзнаўленне сацыяльных групаў, якія дамінавалі за савецкім рэжымам. Даследаванне аспрэчвае «тэорыю змовы» (распаўсюджаную ў СМІ), паводле якой былыя захавальнікі камуністычнага рэжыму адыгрываюць падрыўную ролю ў новых для сябе дэмакратычных варунках.

Эстонія, Латвія, Літва і Польшча сталі сябрамі ў Еўрапейскім Звязе ў 2004 годзе. Іх шлях да дэмакратызацыі пачаўся пятнаццаць гадоў таму, калі адбыліся першыя паўсвабодныя (semi-freely) выбары, якія пазбавілі палітычнай манаполіі Камуністычную партыю. Аднак былыя камуністычныя дзеячы і надалей былі добра заўважныя на палітычнай сцэне. Толькі пасля парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў у 2005 годзе ў Польшчы былыя камуністы насамрэч пачалі губляць свой кантроль над палітычным жыццём.

Альгірдас Бразаўскас (Algirdas Brazauskas), апошні першы сакратар Камуністычнай партыі Літоўскай ССР, стаў старшынёй Сацыял-дэмакратычнай партыі і быў галоўнай фігурай палітычнага жыцця Літвы. У 1990 годзе ён быў першым намеснікам прэм'ер-міністра Літоўскай Рэспублікі, якая толькі што атрымала незалежнасць, а потым стаў першым дэмакратычна абраным прэзідэнтам (1992 — 1997). З лета 2000 года і да канца вясны 2006 ён на пасадзе прэм'ер-міністра даволі паспяхова кіраваў рознымі кааліцыямі ў парламенце. Гэтаксама ў Эстоніі Арнольд Руутэль (Arnold Rüütel), апошні старшыня прэзідыума Вярхоўнага Савета Эстонскай ССР (з 1983 г.), у 1990 годзе стаў першым старшынёй посткамуністычнага эстонскага парламента. Вясной

2001 года быў абраны прэзідэнтам краіны. Латвійская палітычная арэна не прадстаўлена так шырока былымі камуністычнымі дзеячамі, аднак экс-камуністы і былыя наменклатурнікі застаюцца між тых, хто лічыць сябе ўплывовымі асобамі ў краіне.

Акрэсленая вяршыня палітычнага айсберга адлюстроўвае адмысловасць посткамуністычнай кансалідацыі дэмакратыі. Наша мэта — даследаваць, якім чынам палітычны досвед савецкага рэжыму фармуе каркас посткамуністычнай парламенцкай эліты. Уплыў савецкага мінулага варта прызнаць пераходнай, часовай (transitional) з'явай (Berglund, Hellen and Aarebrot, 1998: 370). Недалёкае мінулае паспяхова выкарыстоўваюць у публічных выступах і палітычных спрэчках, фармуючы выбарчыя перавагі (Gaidys, 2005: 72). Маральная тоеснасць (moral collective identities) і арганізацыйныя структуры, атрыманыя ў спадчыну, маюць істотны ўплыў на шматабяцальныя партыйныя структуры і іх дзейнасць (Bennich-Bjorkman, 2005: 2—29). На мікрароўні недалёкае мінулае вызначае ці, ва ўсялякім разе, у значнай ступені фармуе кваліфікацыю, каштоўнасныя арыенціры і амбіцыі тых, хто імкнецца атрымаць і атрымлівае прадстаўнічыя палітычныя пасады.

Пры аналізе дэмакратычнага пераходу наяўнасць альтэрнатыўных элітаў, падрыхтаваных для замены камуністычнай наменклатуры, ёсць важкім фактарам тлумачэння хуткасці і паспяховасці рэвалюцыйных зменаў. Аднак было не так шмат зроблена, каб перайсці ад гэтай крыштальна яснай канцэпцыі да праверкі яе на практыцы.

Калі першае вымярэнне — прысутнасць наменклатуры і чальцоў Камуністычнай партыі ў посткамуністычных дэмакратыях — прыцягнула досыць вялікую ўвагу даследчыкаў (Staniszkis, 1991; Ekiert and Hanson, 2003; Gryzmala-Busse, 2002; Kitschelt, Mansfeldova, Markowski and Toka, 1999; Steen, 1997; Wasilewski and Wnuk-Lipinski, 1995; Mink and Szurek, 1999 etc.), дык другое — лёс і палітычны ўдзел былых дысідэнтаў у дэмакратычных рэжымах — засталіся практычна незаўважанымі. Замест гэтага акцэнт быў зроблены на вырашальнай ролі руху Салідарнасць у Польшчы і нацыянальных рухаў (па сутнасці, антыкамуністычных «парасонавых» арганізацыях, якія паўсталі ў прыбалтыйскіх краінах у 1988—1990 гг.) пасля развалу савецкага рэжыму (Lieven, 1993; Krupavicius, 1998; Pettai and Kreuzer, 1999).

Посткамуністычную рэальнасць у прыбалтыйскіх краінах вызначыла тое, што колькасць патэнцыйных палітыкаў з негатыўным багажом (удзел у савецкай палітыцы) была вялікая. Спіс наменклатуры заставаўся вельмі доўгім, і яна ўсяляк захоўвала сваю значнасць да канца 1990-х. Тым часам колькасць патэнцыйных лідэраў з пазытыўнай (дысідэнцкай) спадчынай была нязначная. У параўнанні з Цэнтральнай Еўропай дысідэнцтва ў савецкай Прыбалтыцы з'яўлялася рэдкай з'явай. У Польшчы рух Салідарнасць стаў найлепшым чынам структураванай дысідэнцкай арганізацыяй за ўсю гісторыю камунізму (Matonyte and Mink, 2003).

Афіцыйная статыстыка, датычная негатыўнага савецкага досведу, насамрэч лёгкадаступная, але адначасна вельмі безаблічная. Між тым няма якіх-небудзь праўдзівых статыстычных звестак адносна людзей з другой групы, якая мела пазітыўны мандат — дысідэнцкі рух. Але такая інфармацыя захоўваецца ў памяці людзей, і палітычныя дзеячы, зазвычай, з радасцю ўзнаўляюць і шырока асвятляюць свой удзел у антыкамуністычнай справе. Гэтая метадалагічная праблема вырашаецца (часткова) пры дапамозе глыбокага вывучэння наяўных баз дадзеных.

Мэтаю аналізу з'яўляецца эмпірычнае вымярэнне зменаў у складзе парламенцкай эліты, у прыватнасці ўстойлівасці ўзнаўлення і ўключэння ў яе вядомых пракамуністычных актывістаў, дысідэнтаў і людзей, раней у палітыку не заангажаваных, а таксама параўнанне спецыфікі парламенцкіх элітаў чатырох краінаў з рознымі палітычнымі лёсамі камуністаў і дысідэнтаў.

Першае меркаванне: за часам дэмакратычных зменаў прадстаўніцтва былых наменклатурнікаў і былых дысідэнтаў павінна было зніжацца праз наплыў людзей, не абцяжараных палітычным досведам савецкага рэжыму. З пункту гледжання выбарчай палітыкі і галасавання, тэмп знікнення з парламенцкай эліты былых наменклатурнікаў павінен быць вышэйшы, чым дысідэнтаў, з прычыны негатыўнага палітычнага досведу.

Меркаванне другое: з пункту гледжання партый і партыйнага рэкрутавання могуць мецца істотныя адрозненні ў здольнасці прыняць былых камуністаў, прадстаўнікоў наменклатуры і антысавецкіх дысідэнтаў. (Пра)камуністычныя партыі мусяць утрымліваць / прыцягваць больш былых камуністаў. Партыі, што грунтуюцца на антыкамуністычных нацыяналістычных

рухах, мусяць утрымліваць / прыцягваць большую колькасць дысідэнтаў.

Меркаванне трэцяе: былыя камуністы і дысідэнты ў посткамуністычных парламенцкіх элітах мусяць мець сацыядэмаграфічныя характарыстыкі, якія розняць іх ад астатніх (быць сталейшымі векам, быць рэпрэзэнтаванымі мужчынскім насельніцтвам тытульнай нацыі, былыя камуністы маюць тэхнічную адукацыю, былыя дысідэнты — гуманітарную і г. д.).

## I. Выбарчыя кампаніі за часам незалежнасці

***Пераходныя парламенты.*** Склады пераходных парламентаў (Contracted Sejm у Польшчы, Constitutional Assembly ў Эстоніі, Founding parliament у Літве і Латвіі) трэба вывучаць праз аналіз ўдзелу ў іх нядаўніх пракамуністычных актывістаў, экс-дысідэнтаў і палітычна неактыўных людзей. Гэта тым больш важна, што, у значнай ступені, такія парламенты вырашалі будучы лёс і мажлівасць далейшага пераабрання экс-дысідэнтаў і экс-камуністаў. Гаворка ідзе не толькі пра пасады ў парламенце, але і пра ўдзел у фармаванні палітычных (партыйных) практык, усталяванне тэндэнцый у грамадскай думцы і прыняцце спецыяльных законаў і пастановаў (гл. **Табліца 1**).

Польшча са сваёй велізарнай колькасцю эксдысідэнтаў у пераходным парламенце (больш за траціну, што значна больш, чым экс-камуністаў, якія ледзьве набралі чвэрць) ёсць асобным выпадкам. Польшча таксама вылучаецца сваёй адносна малой колькасцю парламентараў, якія за савецкім рэжымам былі палітычна пасіўныя (39,6%).

Посткамуністычная Эстонія пачала з tabula rasa і стала краінай найбольш «ачышчынай ад мінулага» на пачатак пераходнага перыяду. Дзве траціны яе парламентараў не былі ўключаныя (ані пазітыўна, ані негатыўна) у палітычнае жыццё за савецкім рэжымам. Колькасць прасавецкіх чальцоў парламента была толькі ў два разы большая за колькасць антысавецкіх (адзін з дзесяці) парламентараў. У Літве назіраем найменш «ачышчаны» пераходны парламент. Толькі палова яго складу раней была палітычна пасіўная. Былыя камуністы налічвалі 41,4%, а былыя дысідэнты складалі толькі 6% парламентараў. Між прыбалтыйскіх краінаў Латвія знаходзіцца недзе пасярэдзіне. Тут колькасць раней не ўключаных у палітыку парламентараў больш значная (61,2%), чым у Літве. Аднак колькасць прасавецкіх актывістаў прыкладна аднолькавая (37,5%). Латвійскі парламент пераходнага перыяду вылучаецца асабліва малым лікам былых дысідэнтаў (1,5%).

***Першыя постсавецкія выбары 1992 — 1994.*** У наступных, ужо цалкам дэмакратычных выбарах, праведзеных у 1992 — 1994 гады, толькі ў парламенце Літвы адбылося паніжэнне колькасці раней палітычна неактыўных людзей (з 52,6 да 42,6%). Колькасць камуністаў павялічылася да 51, 8%, а колькасць экс-дысідэнтаў засталася ранейшай (5,7%). Такім чынам, наяўнасць палітычнага досведу дазволіла былым камуністам выцесніць менш спрактыкаваных палітыкаў-пачаткоўцаў з нацыянальнага руху Саюдзіс (Sajudis), тым часам як занятая дысідэнтамі ніша засталася некранутай. У Польшчы за выбарамі 1993 года адбылася «контррэвалюцыя», якая прынесла поспех былым камуністам, пры тым доля людзей, што раней не праяўлялі палітычнай актыўнасці, захавалася (39,3%). А колькасць экс-дысідэнтаў рэзка зменшылася (да 14,3%), нават калі ўлічыць, што яна засталася па-ранейшаму высокай у параўнанні з прыбалтыйскімі краінамі. У процівагу камуністычным «контррэвалюцыям» у Літве і Польшчы эстонскі і латвійскі парламенты засталіся стабільнымі ў надзейнай адкрытасці раней палітычна неактыў-

| Краіна | Раней палітычна неактыўныя | | Удзельнікі савецкай палітыкі | | Удзельнікі дысідэнцкага руху | | Усіх |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | № | % | № | % | № | % | |
| Літва | 70 | 52.6 | 55 | 41.4 | 8 | 6.0 | 133 |
| Латвія | 123 | 61.2 | 75 | 37.3 | 3 | 1.5 | 201 |
| Эстонія | 71 | 67.6 | 24 | 22.9 | 10 | 9.5 | 105 |
| Польшча | 182 | 39.6 | 114 | 24.8 | 164 | 35.7 | 460 |

**Табліца 1.** Пераходныя парламенты 1990/1992—1992/1994.

| Краіна | Раней палітычна неактыўныя | | Удзельнікі савецкай палітыкі | | Удзельнікі дысідэнцкага руху | | Усіх |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | № | % | № | % | № | % | |
| **Літва** | 60 | 42.6 | 73 | 51.8 | 8 | 5.7 | 141 |
| **Латвія** | 62 | 62 | 32 | 32 | 6 | 6 | 100 |
| **Эстонія** | 71 | 70.3 | 21 | 20.8 | 9 | 8.9 | 101 |
| **Польшча** | 181 | 39.3 | 213 | 46.3 | 66 | 14.3 | 460 |

**Табліца 2.** Першыя дэмакратычныя выбары 1992/1994—1995/1996.

ным людзям. Даволі істотны зрух меў месца ў Латвіі, дзе ў Сейм (*Saiema*) была залучаная вялікая колькасць былых дысідэнтаў, і такім чынам Латвія працягнула сваю запозненую антыкамуністычную рэвалюцыю. Выбарчая кампанія 1992 года ў Эстоніі ў значнай ступені паўтарыла сітуацыю 1990 года па ўсіх трох групах (гл. **Табліца 2**).

***Выбары 1997—2001.*** Цягам наступных выбарчых тэрмінаў (1997 и 2001) Польшча захавала сваю адметнасць: палітыкі з палітычным досведам былі даволі заўважныя фігурамі сярод парламентараў, з якіх толькі нязначная колькасць не мела дачынення да мінулага рэжыму. Выбарчыя цыклы (у нейкім сэнсе эфект маятніка) спрыялі адноснай перавазе экс-камуністаў над экс-дысідэнтамі. У 1997 годзе польскія дысідэнты прасунуліся наперад і налічвалі 25,4% парламентараў (экс-камуністы атрымалі 33%). У 2001 годзе колькасць экс-дысідэнтаў у Сейме паменшылася ў два разы да 12,2%, а экс-камуністы дасягнулі сваёй найбольшай колькасці ў посткамуністычным парламенце Польшчы — 45,4%. Калі параўноўваць чатыры краіны, дык ад пачатку трэціх выбараў (1997) Польшча паказвала найбольш высокі ровень пераабрання экс-камуністаў.

За польскай мадэллю павольнай «рэкамунізацыі» блізка рухаўся эстонскі парламент, дзе колькасць экс-камуністаў вырасла да 38,6% у 1999 годзе і да 39,6% у 2003-м. Паралельна колькасць палітычных «чыстых» эстонскіх парламентараў пачала змяншацца (адпаведна да 61,4 і 57,4%), і былыя эстонскія дысідэнты страцілі сваю істотную ролю. У процівагу польскай сітуацыі яны сталі ў парламенце хутчэй «драбінкамі солі на сподачку», чым структураваным элементам. Пачынаючы ад трэціх дэмакратычных выбараў у Літве і Латвіі колькасць парламентараў, палітычна пасіўных за часам камунізму, пачала імкліва расці (адпаведна з 42,6% да 78% і з 60% да 91%). У Літве гэткія змены ажыццяўляліся коштам памяншэння ліку былых камуністаў, а колькасць былых дысідэнтаў заставалася значнай (паводле прыбалтыйскіх стандартаў), хоць і змяншалася. У латвійскім парламенце колькасць людзей, што не мелі дачынення да палітыкі за часам мінулага рэжыму, стала яшчэ большай. Колькасць былых камуністаў і экс-дысідэнтаў у латвійскім парламенце знізілася прыкладна ў аднолькавых суадносінах.

Падсумоўваючы, бачым, што зніжэнне ролі людзей, што атрымалі які-небудзь досвед (пазітыўны альбо негатыўны) за камуністычным рэжымам, адбывалася рэвалюцыйным шляхам. Самы найлепшы старт меўся ў Эстоніі, дзе пасля пачатковай «зачысткі» (пік якой прыпаў на 1995 год, калі 81% ад агульнай колькасці склалі «чыстыя» парламентары) назіраецца паказальна высокі ўзровень наяўнасці ў парламенцкай эліце былых дысідэнтаў (блізу 10% у першых двух парламентах). Наступныя дэмакратычныя выбары прапускалі ў парламенцкія шэрагі ўсё больш і больш камуністаў (да 40% у сённяшнім *Rigiikogu*), прыпыніўшы абранне вялікай колькасці дысідэнтаў. Такім чынам, палітычная сцэна, ва ўсялякім разе гіпатэтычна, стала менш адчувальнай да мажлівага негатыўнага палітычнага досведу савецкіх часоў.

Літва рэпрэзэнтуе зусім іншую мадэль. Колькасць «чыстых» людзей у посткамуністычным парламенце ўзрастае ад выбараў да выбараў (з 40 да 80%). Колькасць былых камуністаў пасля часовага ўздыму ў 1992 годзе ўстойліва спадае, а экс-дысідэнты захавалі істотную колькасць месцаў у парламенце, нягледзячы на тое, што іх лік зменшыўся ў два разы к 2000 году. Такім чынам, мадэль Літвы, хоць і не пазбаўленая супярэчнасцяў, дэманструе пакрокавае зніжэнне колькасці экс-камуністаў і экс-дысідэнтаў у посткамуністычным парламенце.

Латвія знаходзіцца паміж эстонскай і літоў-

скай мадэлямі. Латвія рухалася шляхам Літвы, і колькасць палітычна незаангажаваных людзей вырасла там яшчэ ў большай ступені (з 60 да 90%). Тым не менш, парламент Латвіі, меўшы даволі высокі адсотак экс-камуністаў, лік якіх моцна зніжаўся (з 40 да 8%), дзіўным чынам пачаў дапускаць экс-дысідэнтаў з пэўнай затрымкай і заўсёды ў мінімальнай колькасці.

У Польшчы камуністычнае мінулае мае самы моцны ўплыў на склад посткамуністычнага парламента. У адрозненне ад прыбалтыйскіх краінаў траекторыя парламенцкіх зменаў у посткамуністычнай Польшчы ішла (ідзе і сёння) праз упарадкаванне «рэвалюцыі» супраць «контррэвалюцыі» — змяняючы суадносіны экс-дысідэнтаў і экс-камуністаў. У процівагу Літве рэкрутаванне польскіх парламенцкіх элітаў працягвае знаходзіцца пад вялікім уздзеяннем камуністычнага палітычнага досведу, а колькасць палітычна незаангажаваных парламентараў застаецца невялікай і пасля 15 гадоў пасля краху камунізму (з 1991 да 2001 вырасла толькі на 3%!) (гл. **Табліца 3**).

Глядзіце ў табліцы 4 абагульненую інфармацыю пра палітычную актыўнасць падчас савецкага рэжыму ў Эстоніі, Латвіі, Літве і Польшчы. Рост паказніка палітычна незаангажаваных людзей супраць экс-камуністаў і экс-дысідэнтаў цягам 5 тэрмінаў у прыбалтыйскіх краінах і 4 тэрмінаў у Польшчы, з улікам цыркуляцыі «новаспечаных» парламентараў (пераабраныя парламентары не ўлічаныя ў статыстычных звестках, прыведзеных у табліцы 4), дае нам мажлівасць акрэсліць балтыйскую мадэль.

Дзве трацiны парламентараў у Прыбалтыцы не мелі якога-небудзь палітычнага досведу за камуністычным рэжымам, тым часам як кожны чацвёрты альбо пяты валодаў такім досведам (пры нязначнай прысутнасці дысідэнтаў — 3—6%). У польскай мадэлі менш за палову парламентараў не былі ўключаныя ў палітычнае жыццё, менш за трацiну з'яўляюцца былымі камуністамі, адна пятая — з дысыдэнцкім мінулым. Польшча падобная да прыбалтыйскіх краінаў агульным роўнем рэпрэзентацыі экс-камуністаў цягам усіх выбарчых кампаній ажно да 2005 года (блізу 30%). Тым не менш, Польшча моцна адрозніваецца перавышэннем ў пяць—дзесяць разоў колькасці экс-дысідэнтаў між парламентараў і вельмі нізкім роўнем абрання людзей, што не валодаюць палітычным досведам часоў камунізму. Адхіленні ў трох прыбалтыйскіх краінах таксама вартыя таго, каб пра іх узгадаць. Эстонія дэманструе зрух у бок экс-дысідэнтаў, а Літва — у бок экс-камуністаў, тым часам як Латвія ўяўляе з сябе найбольш «нейтральную» мадэль у тым сэнсе, што яна мае самую высокую колькасць палітычна незаангажаваных парламентараў (гл. **Табліца 4**).

Параўнальны аналіз роўню пераабрання палітычна незаангажаваных людзей супраць людзей з камуністычным і дысідэнцкім мінулым у посткамуністычныя парламенцкія эліты чатырох краінаў забяспечвае далейшы аналіз іх палітыч-

| Гады | Краіна | Раней палітычна неактыўныя | | Удзельнікі савецкай палітыкі | | Удзельнікі дысідэнцкага руху | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | № | % | № | % | № | % | |
| 1995/1997 | Літва | 100 | 73.0 | 28 | 20.4 | 9 | 6.6 | 141 |
| | Латвія | 69 | 69 | 27 | 27 | 4 | 4 | 100 |
| | Эстонія | 81 | 80.2 | 17 | 16.8 | 3 | 3.0 | 101 |
| | Польшча | 191 | 41.5 | 152 | 33.0 | 117 | 25.4 | 460 |
| 1998/2001 | Літва | 107 | 75.9 | 31 | 22.0 | 3 | 2.1 | 141 |
| | Латвія | 83 | 83 | 16 | 16 | 1 | 1 | 100 |
| | Эстонія | 62 | 61.4 | 39 | 38.6 | 0 | 0 | 101 |
| | Польшча | 195 | 42.4 | 209 | 45.4 | 56 | 12.2 | 460 |
| 2002/2004 | Літва | 110 | 78.0 | 27 | 19.1 | 4 | 2.8 | 141 |
| | Латвія | 91 | 91 | 8 | 8 | 1 | 1 | 100 |
| | Эстонія | 58 | 57.4 | 40 | 39.6 | 3 | 3.0 | 101 |

**Табліца 3**. Выбары 1995/1996—2002/2004.

| Краіна | Раней палітычна неактыўныя | | Удзельнікі савецкай палітыкі | | Удзельнікі дысідэнцкага руху | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | № | % | № | % | № | % | |
| Літва | 314 | 66.1 | 143 | 30.1 | 18 | 3.8 | 475 |
| Латвія | 315 | 73.3 | 104 | 24.2 | 11 | 2.6 | 430 |
| Эстонія | 238 | 67.4 | 95 | 26.9 | 20 | 5.7 | 353 |
| Польшча | 614 | 48.6 | 382 | 30.2 | 268 | 21.2 | 1264 |

**Табліца 4.** Палітычная актыўнасць парламентарыяў за часам савецкага рэжыму (усе выбары 1990—2004, улічваюцца толькі новаабраныя дэпутаты).

ных уласцівасцяў. Найперш, агульны ровень пераабрання ёсць вельмі нізкім ва ўсіх трох групах усіх чатырох краінах. У прыбалтыйскіх краінах разглядаюцца 5 выбарчых кампаній, таму найбольшы індэкс пераабрання ў 2005 годзе роўны пяці. Такім чынам, у Літве ён роўны 1,83, у Латвіі — 1,86 і ў Эстоніі — 1,56. Нязменна, ва ўсіх трох прыбалтыйскіх краінах былыя камуністы часцей пераабіраюцца, чым людзі без якога-небудзь палітычнага досведу: у Літве ровень пераабрання камуністаў роўны 2,19 супраць 1,7 раней незаангажаваных людзей, у Латвіі адпаведна 2,5 супраць 1,78 і ў Эстоніі — 1,63 і 1,53. Выяўляецца, былыя камуністы атрымліваюць самыя вялікія перавагі на выбарах у Латвіі, а не ў Літве, дзе паводле абсалютнага вымярэння экс-камуністы рэпрэзэнтаваныя значна лепш.

Ровень пераабрання прыбалтыйскіх экс-дысідэнтаў крыху вышэйшы, хоць іх абсалютная колькасць невысокая (да таго ж зніжаецца) і надта маленькая, каб улічвацца як статыстычна істотная. У Літве ад часоў трэцяй выбарчай кампаніі (1996) аніводзін новы экс-дысідэнт не быў абраны ў парламент, тады як да 2004 года зусім не шмат экс-камуністаў паспяхова рэалізоўвалі свае палітычныя амбіцыі. Адзіны парламентар, які абіраўся цягам усіх пяці посткамуністычных выбарчых кампаній у Літве, — гэта Чэсловас Юрсенас (Ceslovas Jursenas), выбітны экс-камуніст і наменклатурнік, які выступаў за незалежнасць у 1989 — 1991 гады, і знакаміты прыхільнік сацыял-дэмакратаў у посткамуністычны час.

Сімптаматычна, што ў Латвіі найбольш паспяхова пераабіраныя ўсе пяць тэрмінаў тыя парламентары, хто не быў заангажаваны ў палітыку да развалу камунізму. Гэтаксама, як і ў Літве, латвійскія дысідэнты адсутнічалі сярод новаабраных парламентараў чацвёртай выбарчай кампаніі. Ад таго часу, у процівагу Літве, некалькі экс-камуністаў бралі ўдзел у выбарчай кампаніі і патрапілі-такі ў латвійскі парламент на свой першы тэрмін. Тым не менш, тыя экс-камуністы, што намёртва «прыкіпелі» да сваёй палітычнай кар'еры, сталі паспяховымі адмыслоўцамі ў палітыцы.

У Эстоніі дысідэнты праходзілі як новаабраныя цягам усіх дэмакратычных выбараў (і ў параўнанні з астатнімі трыма краінамі эстонскія дысідэнты валодалі самым нізкім роўнем пераабрання). Эстонскія экс-камуністы ўвайшлі ў апошні посткамуністычны парламент як новаабраныя нават большай колькасцю (новы ўздым адбыўся ў 2003 годзе). У Эстоніі, адрозна ад Латвіі, цягам усіх выбарчых кампаній былыя камуністы кансалідавалі і пашыралі свае выбарчыя мажлівасці. Між эстонскіх «бацькоў-заснавальнікаў», якія атрымлівалі парламенцкі мандат без перапынку цягам пяці выбарчых кампаній, адзін парламентар раней не браў удзелу ў палітыцы, а адзін быў камуністам.

У Польшчы за чатырма выбарчымі перыядамі індэкс пераабрання роўны 1,78 пры 4 мажлівых (даволі падобна да роўню прыбалтыйскіх краінаў за 4 выбарчыя перыяды) і таксама, як і ў прыбалтыйскіх краінах, адлюстроўвае спрыяльны зрух у бок экс-камуністаў (ровень пераабрання 2,07) у параўнанні з тымі, хто раней не займаўся палітыкай (1,44), і экс-дысідэнтамі (1,88). Гэтая выяўленая насуперак нашай «рэвалюцыйнай» гіпотэзе схільнасць да абрання ў посткамуністычны парламент экс-камуністаў таксама выразна рэпрэзэнтуецца польскімі «бацькамі-заснавальнікамі», якія валодаюць парламенцкім мандатам без перапынку ва ўсіх чатырох сеймах. У 2001 годзе з усіх 38 «бацькоў-заснавальнікаў» 30 былі экс-камуністамі, 2 — былымі дысідэнтамі і 6 — раней незаангажаваныя ў палітыку. Ровень пераабрання камуністаў у Польшчы перавысіў ровень пераабрання экс-

дысідэнтаў і раней палітычна незаангажаваных парламентараў з часу трэціх выбараў у 1997 (магчыма, ён пераадолены на нядаўніх выбарах 2005 года, па якіх звестак у нас няма). Праз 15 гадоў пасля развалу камунізму ўсё новыя і новыя дысідэнты працягваюць абірацца ў польскі парламент. Найбольш значная (паводле абсалютных і адносных вымярэнняў) колькасць новаабраных дэпутатаў раней былі ангажаваныя ў палітычную дзейнасць.

Падсумоўваючы, можна казаць, што ва ўсіх чатырох посткамуністычных краінах былыя камуністы валодаюць, як ні дзіўна, выбарчымі перавагамі перад тымі, хто быў палітычна незаангажаваны за камунізмам. Хоць колькасць экс-камуністаў, да гэтага часу рэпрэзэнтаваных у посткамуністычных парламенцкіх элітах, значна адрозніваецца ў трох прыбалтыйскіх краінах і Польшчы, ва ўсіх чатырох краінах колькасць экс-камуністаў перавышае колькасць экс-дысідэнтаў паводле абсалютнага вымярэння, а таксама паводле роўню выбарчага поспеху і трываласці іх сімвалічнай стваральнай ролі. Пазіцыі экс-камуністаў-ветэранаў, якія дасюль валодаюць парламенцкімі мандатамі, праз 15 гадоў пасля рэвалюцыі вельмі трывалыя ў Польшчы, а ўслед ідуць Літва і Эстонія. Выключэннем ёсць Латвія: у 2005 годзе «бацькі-заснавальнікі» сярод парламентараў былі рэпрэзэнтаваныя толькі раней палітычна незаангажаванымі людзьмі.

## II. Партыйная структура парламенцкай эліты

Наша гіпотэза заснавана на тым, што з пункту гледжання палітычных партый (іх арганізацыйнай культуры, мадэляў прыцягнення новых сябраў, ідэалогій і праграмаў) могуць існаваць істотныя адрозненні, датычныя стаўлення да экс-камуністаў, экс-дысідэнтаў і людзей без палітычнага досведу. Палітычныя арганізацыі, што вядуць свой радавод ад Камуністычнай партыі, маглі б мець і прыцягваць у далейшым больш экс-камуністаў, чым іншыя палітычныя партыі. Партыі, запачаткаваныя ў нетрах антыкамуністычна-нацыяналістычных рухаў, маглі б налічваць і рэкрутаваць больш экс-дысідэнтаў. Партыі з меншай дакладнай ідэалагічнай накіраванасцю маглі б разлічваць на раней палітычна незаангажаваных людзей (гл. **Табліцы 5—8**).

Як вядома, былыя камуністы дамінуюць між сацыялістаў / сацыял-дэмакратаў у Літве, дзе яны складаюць практычна палову левых — 46,3% (адзін з найбольш паспяховых палітычных рухаў на працягу ўсяго дэмакратычнага перыяду). Былых дысідэнтаў найбольш у правых і кансерватыўных партыях (з 18 дысідэнтаў, што належаць да парламенцкай эліты, 7 лічацца ў шэрагах хрысціянскіх дэмакратаў, а 7 — кансерватараў). Былыя дысідэнты ёсць стрыжнёвай асновай гэтых партый у парламенце (блізу 20% ад агульнага складу). Раней палітычна незаангажаваныя людзі, што сталі ў посткамуністычны час парламентарамі найбольш часта сустракаюцца сярод цэнтрысцкіх сілаў. Яны складаюць асноўную масу ўсіх левых лібералаў, якія з'явіліся ў 1996 годзе (35 чалавек, што склала 85% ад 37), лібералаў (адпаведна 56 або 80% ад 70) і папулістаў (49 або 80% ад 59). У Літве практычна толькі раней палітычна незаангажаваныя людзі (9 парламентараў з 10) рэпрэзэнтуюць партыі этнічных меншыняў (рускія, палякі).

Сітуацыя ў Эстоніі моцна размывае гэтую мадэль. Былыя камуністы, пераабраныя ў дэмакратычны *Rigiikogu*, сканцэнтраваны сярод правых (лібералаў і кансерватараў). Яны складаюць 1/4 — 1/3 прадстаўнікоў гэтых партый, якія ёсць найбольш паспяховымі на эстонскай палітычнай арэне ад пачатку посткамуністычнай трансфармацыі. Былыя камуністы і раней палітычна незаангажаваныя людзі ў роўных долях прадстаўленыя ў партыях этнічнай меншыні (рускія). Агульная колькасць іх парламентараў складае 10 (5 былых камуністаў, 5 незаангажаваных). Гэтым Эстонія адрозніваецца ад Літвы, дзе былыя камуністы належаць выключна да этнічнай бальшыні. Але абедзве краіны падобныя тым, што экс-дысідэнтаў зусім няма між прадстаўнікоў нацыянальных меншыняў. Большасць прадстаўнікоў сацыялістаў у эстонскім парламенце належаць да раней палітычна незаангажаваных людзей (29 чалавек або 70% ад 42). Можна дадаць да азначанага, што эстонскія сацыялісты налічваюць 3 былых дысідэнтаў, а таксама 10 былых камуністаў. Раней палітычна незаангажаваныя ўваходзяць у Аграрную партыю (17 з 24). Разам з экс-камуністамі яны нязменна становяцца частымі пераможцамі між эстонскіх лібералаў і кансерватараў (адпаведна 76 чалавек або 63% ад агульнае колькасці 117; 48 або 60% — ад 77 і 83 або 75% — ад 111). Былыя эстонскія дысідэнты (агульнай колькасцю 15) удзельнічаюць ва ўсіх палітычных сілах (3 са-

цыялісты, 3 аграрыі, 2 левыя лібералы, 3 правыя лібералы і 2 кансерватары). Такім чынам, у Эстоніі няма істотнай залежнасці партыйных пераваг ад камуністычнага мінулага. Для парламента Эстоніі характэрная адсутнасць сацыялістаў і працяглае дамінаванне правацэнтрыстаў.

Гэтаксама, як і ў Эстоніі, слабыя сацыял-дэмакратычныя сілы Латвіі галоўным чынам прадстаўлены раней палітычна пасіўнымі людзьмі (64 або 85% ад 74). У Латвіі адносна дужыя правыя радыкалы маюць прадстаўнікоў у парламенце (агульная колькасць парламентараў 36). Між іх ёсць былыя дысідэнты (6 з 15 дысідэнтаў), тым не менш, асноўная маса правых радыкалаў складаецца з раней палітычна незаангажаваных людзей (28). Дысідэнты таксама прысутнічаюць між аграрыяў, лібералаў і хрысціянскіх дэмакратаў. Раней палітычна неактыўныя людзі прысутнічаюць найперш між латышскіх кансерватараў (109 чалавек або 90% ад агульнае колькасці 117). Таксама, як і ў Эстоніі, пераабраныя былыя латышскія камуністы пераважна фармуюць ліберальныя партыі (37 або кожны другі парламентар з 74 лібералаў), ёсць сярод іх і левыя лібералы (12 з 23 парламентараў) і аграрыі (10 з 40). Іх таксама дастаткова між тых, хто балатаваўся не ад партый (5 з 12). Такім чынам, латышскі нацыяналізм пазначаны досведам дысідэнцтва, а латышскі лібералізм, нечакана, мае акрэслены «камуністычны» background.

У Польшчы гэтаксама, як і ў Літве, удзел у камуністычным рэжыме ёсць важкай лініяй расколу партыйнага краявіду ў парламенце. Калі браць пад увагу памеры польскага парламента і вялікую колькасць экс-дысідэнтаў між парламентараў, Польшча выяўляецца цудоўным тэстам для ўсяго сказанага. Польскія экс-камуністы (у большай ступені, чым у Літве) належаць і фармуюць выключна посткамуністычныя сілы ў парламенце: 489 былых камуністаў (або 71,1% ад агульнай іх колькасці) належаць да сацыял-дэмакратаў, а 156 (або 22,7% ад агульнай іх колькасці) — да аграрыяў. Інакш кажучы, у Польшчы былыя камуністы складаюць 2/3 ад агульнай колькасці сацыял-дэмакратаў і палову аграрыяў.

Былыя польскія дысідэнты не маюць палітычнай еднасці, аднак сканцэнтраваныя ў цэнтрысцкіх і правых партыях: левыя і правыя лібералы, хрысціянскія дэмакраты, кансерватары. Самая вялікая канцэнтрацыя экс-дысідэнтаў у левых лібералаў, дзе кожны другі сябра мае якоенебудзь дачыненне да дысідэнцтва (107 з 196). Але часцей экс-дысідэнты далучаюцца да хрысціянскіх дэмакратаў (123 чалавекі або 30,5% ад агульнае колькасці 403). Экс-дысідэнты таксама належаць да лагера кансерватараў (74 парламентары) і правых лібералаў (42 парламентары). Тым не менш, у апошніх дзвюх партыях дамінуюць тыя, хто раней не меў палітычнага досведу (адпаведна правыя лібералы 71 з 121 і кансерватары 98 з 178). Найбольшае пашырэнне раней палітычна незаангажаваныя людзі атрымалі між хрысціянскіх дэмакратаў (159 або 21,2% ад агульнай колькасці), сацыял-дэмакратаў (150 або 20%) і аграрыяў (155 або 20,7%). Як і ў прыбалтыйскіх краінах (у Латвіі этнічныя партыі ў парламенце не прадстаўлены), людзі без ранейшага палітычнага досведу ў посткамуністычнай Польшчы прадстаўляюць у парламенце партыі этнічных (рэгіянальных) меншыняў. З 24 парламентараў ад гэтых партый 21 не мелі палітычнай чыннасці за камунізмам, 1 — былы дысідэнт, а 2 — экс-камуністы.

Такім чынам, польская мадэль даволі ясная і акрэсленая: экс-камуністы фармуюць левую частку палітычнага спектра, экс-дысідэнты — цэнтрысты і правыя (свецкія і рэлігійныя). Тым часам раней не заангажаваныя ў палітыку людзі размеркаваліся даволі выпадковым чынам ва ўсім спектры: 40% між левых (сацыял-дэмакраты і аграрыі), 40% належаць да правых, рэшта належыць да цэнтрысцкіх сілаў, партый этнічных мяншыняў і правых радыкалаў (дзе прысутнасць экс-камуністаў незаўважная, як і ў парламентах прыбалтыйскіх краінаў).

## III. Сацыяльна-дэмаграфічныя паказнікі парламенцкай эліты

Гіпотэза заключаецца ў тым, што экс-камуністы і экс-дысідэнты ў посткамуністычнай парламенцкай эліце мусяць валодаць сацыяльнымі і дэмаграфічнымі адметнасцямі, якія розняць іх ад астатніх парламентараў (быць сталейшымі векам, мужчынскага полу, экс-камуністы мусяць мець схільнасць да тэхнічных навук, а экс-дысідэнты — да гуманітарных і г. д).

Парламентары-жанчыны ва ўсіх трох прыбалтыйскіх краінах асабіста не бралі ўдзелу ў дысідэнцкім руху. Аніводная з прыбалтыйскіх жанчын-парламентараў не мае дысідэнцкага мінулага. Толькі ў Польшчы некалькі жанчын у парламенце — былыя дысідэнты (яны склада-

| | Партыйныя групы | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Камуністы | Сацыялісты/ сацыял-дэмакраты | Аграрыі | Левыя лібералы | Хрысціянскія дэмакраты (каталікі) | Кансерватары | Правіца | Этнічныя меншыні | Іншыя | Без партыі | Лібералы | Антыкамуністычны рух | Усіх |
| **Палітычна неактыўныя або няма інфармацыі** | 0 (0, 0)* | 70 (15.7) | 5 (1.1) | 32 (7.3) | 25 (5.6) | 84 (18.8) | 7 (1.6) | 9 (2.0) | 49 (11.0) | 19 (4.3) | 56 (12.5) | 91 (20.4) | 447 (100.0) |
| **Удзельнікі савецкай палітыкі** | 6 (2.8) | 99 (46.3) | 6 (2.8) | 5 (2.3) | 1 (0.5) | 14 (6.5) | 1 (0.5) | 1 (0.5) | 9 (4.2) | 2 (0.9) | 13 (6.1) | 57 (26.6) | 214 (100.0) |
| **Удзельнікі дысідэнцкага руху** | 0 (0.0) | 2 (6.3) | 0 (0.0) | 0 (0.0) | 7 (21.9) | 7 (21.9) | 2 (6.3) | 0 (0.0) | 1 (3.1) | 1 (3.1) | 1 (3.1) | 11 (34.4) | 32 (100.0) |
| **Цалкам** | 6 (0.9) | 171 (24.7) | 11 (1.6) | 37 (5.3) | 33 (4.8) | 105 (15.2) | 10 (1.4) | 10 (1.4) | 59 (8.5) | 22 (3.2) | 70 (10.1) | 159 (22.9) | 693 (100.0) |

**Табліца 5.** Палітычная актыўнасць парламентараў Літвы за часам савецкага рэжыму паводле партыйных групаў (1990 —2004).

| | Партыйныя групы | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Камуністы | Сацыялісты/ сацыял-дэмакраты | Зялёныя | Аграрыі | Левыя лібералы | Правыя лібералы | Кансерватары | Этнічныя меншыні | Іншыя | Хрысціянскія дэмакраты (каталікі) | Усіх |
| **Палітычна неактыўныя або няма інфармацыі** | 0 (0.0)* | 29 (10.9) | 1 (0.4) | 17 (6.4) | 76 (28.5) | 48 (18.0) | 83 (31.1) | 5 (1.9) | 7 (2.6) | 1 (0.4) | 267 (100.0) |
| **Удзельнікі савецкай палітыкі** | 1 (0.9) | 10 (8.6) | 0 (0.0) | 4 (3.4) | 39 (33.6) | 26 (22.4) | 26 (22.4) | 5 (4.3) | 5 (4.3) | 0 (0.0) | 116 (100.0) |
| **Удзельнікі дысідэнцкага руху** | 0 (0.0) | 3 (20.0) | 0 (0.0) | 3 (20.0) | 2 (13.3) | 3 (20.0) | 2 (13.3) | 0 (0.0) | 2 (13.3) | 0 (0.0) | 15 (100.0) |
| **Цалкам** | 1 (0.3) | 42 (10.6) | 1 (0.3) | 24 (6.0) | 117 (29.4) | 77 (19.3) | 111 (27.9) | 10 (2.5) | 14 (3.5) | 1 (0.3) | 398 (100.0) |

**Табліца 6.** Палітычная актыўнасць парламентараў Эстоніі за часам недэмакратычнага рэжыму паводле партыйных групаў (1990—2003).

| | Партыйныя групы | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Камуністы | Сацыялісты/ сацыялдэмакраты | Аграрыі | Левые лібералы | Кансерватары | Правіца | Без партыі | Лібералы | Хрысціянскія дэмакраты (каталікі) | Антыкамуністычны рух | Усіх |
| **Палітычна неактыўныя або няма інфармацыі** | 35 (8.2)* | 64 (15.0) | 29 (6.8) | 11 (2.6) | 109 (25.5) | 28 (6.5) | 7 (1.6) | 36 (8.4) | 21 (4.9) | 88 (20.6) | 428 (100.0) |
| **Удзельнікі савецкай палітыкі** | 34 (21.5) | 10 (6.3) | 10 (6.3) | 12 (7.6) | 6 (3.8) | 2 (1.3) | 5 (3.2) | 37 (23.4) | 2 (1.3) | 40 (25.3) | 158 (100.0) |
| **Удзельнікі дысідэнцкага руху** | 1 (6.7) | 0 (0.0) | 1 (6.7) | 0 (0.0) | 2 (13.3) | 6 (40.0) | 0 (0.0) | 1 (6.7) | 1 (6.7) | 3 (20.0) | 15 (100.0) |
| **Цалкам** | 70 (11.6) | 74 (12.3) | 40 (6.7) | 23 (3.8) | 117 (19.5) | 36 (6.0) | 12 (2.0) | 74 (12.3) | 24 (4.0) | 131 (21.8) | 601 (100.0) |

**Табліца 7.** Палітычная актыўнасць парламентараў Латвіі за часам недэмакратычнага рэжыму паводле партыйных групаў (1990—2002).

| | Партыйныя групы | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Сацыялісты/ сацыялдэмакраты | Аграрыі | Левые лібералы | Правыя-лібералы | Хрысціянскія дэмакраты (каталікі) | Кансерватары | Правіца | Этнічныя меншыні | Іншыя | Усіх |
| **Палітычна неактыўныя або няма інфармацыі** | 150 (20.0) | 155 (20.7) | 67 (8.9) | 71 (9.5) | 159 (21.2) | 98 (13.1) | 25 (3.3) | 21 (2.8) | 3 (0.4) | 749 (100.0) |
| **Удзельнікі савецкай палітыкі** | 489 (71.1) | 156 (22.7) | 22 (3.2) | 8 (1.2) | 5 (0.7) | 6 (0.9) | 0 (0.0) | 2 (0.3) | 0 (0.0) | 688 (100.0) |
| **Удзельнікі дысідэнцкага руху** | 20 (5.0) | 22 (5.5) | 107 (26.6) | 42 (10.4) | 123 (30.5) | 74 (18.4) | 13 (3.2) | 1 (0.2) | 1 (0.2) | 403 (100.0) |
| **Цалкам** | 659 (35.8) | 333 (18.1) | 196 (10.7) | 121 (6.6) | 287 (15.6) | 178 (9.7) | 38 (2.1) | 24 (1.3) | 4 (0.2) | 1840 (100.0) |

**Табліца 8.** Палітычная актыўнасць парламентараў Латвіі за часам недэмакратычнага рэжыму паводле партыйных групаў (1990—2001).

юць толькі 7% ад усіх экс-дысідэнтаў). У парламенцкай эліце жанчыны-парламентары таксама значна менш дасведчаныя і ў камуністычнай палітычнай дзейнасці, чым іх калегі-мужчыны. Жанчын шмат між тых, хто за часам камунізму не меў досведу ў палітыцы. Нягледзячы на тое, што для ўсіх чатырох краінаў прымальная гэткая мадэль, найболей яскрава яна выяўленая ў Літве, дзе 87,3% посткамуністычных парламентараў жаночага полу не былі палітычна заангажаваныя ў савецкі час. Найменш выразна такая тэндэнцыя прасочваецца ў Польшчы, дзе толькі 60,5% жанчын-парламентараў не мелі якога-небудзь палітычнага досведу за часам камунізму. Гэтыя лічбы ў рэтраспектыве выяўляюць мужчынскую прыроду і склад былой наменклатуры (камуністычных дзеячаў) і дысідэнцкага руху. Хоць патрыярхальны характар былой наменклатуры агульнапрызнаны (Matonyte, 2005), звесткі пра прадстаўнікоў дысідэнцкага руху не лёгкадасяжныя. Між тым рэтраспектыўны падтэкст дае нам права таксама сцвярджаць, што антыкамуністычны палітычны досвед быў ад пачатку пераважна мужчынскай дзейнасцю (гл. **Табліца 9**).

Літоўскія і латышскія дэпутаты-экс-дысідэнты маюць значна ніжэйшы ровень адукацыі, чым парламентары наагул. 90 — 95% парламенцкай эліты з вышэйшай адукацыяй, а што да парламентараў з дысідэнцкім мінулым гэты паказнік сягае 72% у Літве і 63% у Латвіі.

Між тым экс-дысідэнты ў эстонскім і польскім парламентах не адрозніваюцца больш нізкім (ці высокім) роўнем адукацыі. У Эстоніі розніца роўню адукацыі ў трох даследаваных групах неістотная (ва ўсіх групах практычна 100% парламентараў маюць вышэйшую адукацыю). У параўнанні з прыбалтыйскімі польскія парламентары маюць самы нізкі ровень адукацыі (76,2%). Аднак самая вялікая колькасць парламентараў без вышэйшай адукацыі не між былых дысідэнтаў, а між тых, хто за камунізмам не меў палітычнага досведу (72,6%). Польскія (шматлікія) і латышскія (нешматлікія) экс-камуністы, што сталі посткамуністычнымі парламентарамі, маюць самы высокі ровень адукацыі, калі параўноўваць з астатнімі дзвюма катэгорыямі, тады як літоўскія і эстонскія экс-камуністы паказваюць вынік блізкі да сярэдняга між усіх парламентараў. Гэтыя назіранні сведчаць, што высокі ровень адукацыі можа лічыцца «заспакаяльнай умовай» для былых камуністаў у час пераходу ў посткамуністычнае палітычнае жыццё (гл. **Табліца 10**).

Што тычыцца тыпу універсітэцкай адукацыі (тэхнічныя і прыродазнаўчыя навукі супраць гуманітарна-сацыяльных і юрыспрудэнцыі), дык, на жаль, у нас няма дадзеных пра эстонскую парламенцкую эліту. Аднак звесткі, даступныя адносна трох краінаў, праліваюць святло на тып адукацыі як фактар дыферэнцыяцыі для тых, хто быў і хто не быў уключаны ў палітычную дзейнасць за часам камунізму.

Літоўскія і латышскія парламентары (адпаведна 53,7 і 51,7%) пераважна атрымалі адукацыю ў галінах інжынерыі, медыцыны і прыродазнаўчых навук, што ёсць наступствамі пашыранага савецкага стылю адукацыі палітычных элітаў (Antanaitis, 2002). Для Літвы тэхнічная адукацыя не ёсць дыферэнцоўным фактарам: экс-камуністы, экс-дысідэнты і палітычна незаангажаваныя людзі размеркаваныя пароўну — прыблізна кожны другі парламентар.

У Латвіі, аднак, тэхнічная адукацыя з'яўляецца адрознай рысай былых камуністаў (60,6%), а яе адсутнасць характэрная для экс-дысідэнтаў (18,2%). Варта нагадаць, што латышскія дэпутаты-экс-дысідэнты наагул радзей маюць вышэйшую адукацыю. Польскія посткамуністычныя эліты не выяўляюць такога яўнага «тэхнакратычнага» характару, яны даволі разнастайныя паводле сваіх адукацыйных характарыстык. Дадатковае «польскае выключэнне» спраўджвае сябе праз наяўнасць у многіх парламентараў прававой адукацыі (прыкладна 13,7% польскіх дэпутатаў — юрысты, тады як у прыбалтыйскіх краінах такіх блізу 3—5%). Яшчэ больш уражвае тое, што польскія экс-дысідэнты часта (17,2%) маюць адукацыю гэтага тыпу, і між усіх парламентараў экс-дысідэнты найчасцей валодаюць прававой адукацыяй (тады як у прыбалтыйскіх краінах аніхто з дысідэнтаў такой адукацыі не мае). Падсумоўваючы сказанае пра адукацыю, зазначым, што прыбалтыйская (Латвія і Літва) і польская мадэлі цалкам адрозныя. У прыбалтыйскіх краінах пераважаюць парламентары з тэхнічнай адукацыяй, якую найчасцей маюць былыя камуністы. У выпадку Польшчы тэхнічная адукацыя сустракаецца нароўні з гуманітарнай і сацыяльнай (з цягам часу перавага ссоўваецца ў бок гуманітарна-сацыяльнай адукацыі). Польскія экс-дысідэнты ў парламенце адрозніваюцца ад экс-камуністаў і раней палітычна незаангажаваных людзей сваёй адносна моцнай адукацыяй у юрыспрудэнцыі, што

| Краіна | Раней палітычна неактыўныя | | Удзельнікі савецкай палітыкі | | Удзельнікі дысідэнцкага руху | | Усіх жанчын | | Цалкам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | № | % | № | % | № | % | № | % | |
| Літва | 55 | 87.3 | 8 | 12.7 | 0 | 0 | 63 | 13.3 | 475 |
| Латвія | 42 | 84.0 | 8 | 16.0 | 0 | 0 | 50 | 11.6 | 430 |
| Эстонія | 40 | 80.0 | 10 | 20.0 | 0 | 0 | 50 | 14.2 | 353 |
| Польшча | 101 | 60.5 | 47 | 28.1 | 19 | 11. 4 | 167 | 13.2 | 1264 |

**Табліца 9.** Жанчыны-дэпутаты і іх палітычны досвед за савецкім часам (1990—2004, толькі новыя дэпутаты).

| Краіна | Раней палітычна неактыўныя | | Удзельнікі савецкай палітыкі | | Удзельнікі дысідэнцкага руху | | Усіх з універсітэцкай адукацыяй | | Цалкам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | № | % | № | % | № | % | № | % | |
| Літва | 303 | 96.5 | 137 | 95.8 | 13 | 72.2 | 453 | 95.4 | 475 |
| Латвія | 270 | 90.6 | 79 | 94.0 | 7 | 63.6 | 356 | 90.6 | 393 |
| Эстонія | 159 | 99.4 | 76 | 100 | 12 | 100 | 247 | 99.6 | 248 |
| Польшча | 446 | 72.6 | 312 | 81.7 | 205 | 76.5 | 963 | 76.2 | 1264 |

**Табліца 10.** Парламентары з універсітэцкай адукацыяй і іх палітычны досвед за савецкім часам (1990—2004, толькі новыя парламентары).

| Краіна | Раней палітычна неактыўныя | | Удзельнікі савецкай палітыкі | | Удзельнікі дысідэнцкага руху | | Усіх з тэхнічнай / прыродазнаўчай адукацыяй | | Усіх |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | № | % | № | % | № | % | № | % | |
| Літва | 164 | 54.1 | 72 | 52.9 | 6 | 50.0 | 242 | 53.7 | 475 |
| Латвія | 157 | 50.0 | 63 | 60.6 | 2 | 18.2 | 222 | 51.7 | 393 |
| Польшча | 230 | 37.5 | 136 | 35.6 | 82 | 30.6 | 448 | 35.4 | 1264 |

**Табліца 11.** Парламентары з тэхнічнай / прыродазнаўчай адукацыяй і іх палітычны досвед за савецкім часам (1990—2004, толькі новыя парламентары).

робіць іх спецыялістамі ў напісанні і прымяненні новых палітычных законаў (гл. **Табліца 11**).

Што тычыцца рэпрэзентаваных у парламенце этнічных меншыняў, дык Польшча тут — асобны выпадак. Найперш, этнічнае пытанне аніколі не было прадметам палітычных спрэчак у Польшчы, і польскі парламент не сутыкаўся з праблемай этнічных меншыняў (цягам 4 тэрмінаў толькі 11 парламентараў ці 1% не былі этнічнымі палякамі). Становішча ў прыбалтыйскіх краінах істотна адрозніваецца. Тут праходзяць вялікія спрэчкі наконт ролі рускіх (рускамоўных) у прыбалтыйскіх краінах: ці можна прызнаць іх этнічнай меншынёй (культурнай супольнасцю з гістарычнай традыцыяй, як, прыкладам, польская меншыня ў Літве) альбо, хутчэй, «чалавечым элементам савецкай акупацыі» з няпрацяглым досведам пражывання ў Прыбалтыцы. Насуперак гэтым спрэчкам і метадалагічным цяжкасцям адносна адсочвання этнічнага пахо-

джання парламентараў, рускія адыгрываюць істотную ролю ў посткамуністычнай палітыцы Прыбалтыкі.

Тры прыбалтыйскія краіны істотна розняцца паводле свайго этнічнага складу і палітыкі грамадзянства. Літва дэманструе найбольшую ступень унутранай інтэграцыі (пры тым доля рускамоўных у структуры насельніцтва тут самая нізкая — блізу 8% у 2003). Латвія і Эстонія маюць больш нацыяналістычнае заканадаўства і вялікую колькасць рускіх. Блізу траціны насельніцтва Эстоніі і Латвіі ў 2003 годзе былі рускамоўныя, прыблізна палова з іх валодала прыбалтыйскім грамадзянствам. Другая палова ўяўляла з сябе неграмадзян. 3 — 5% рускіх з'яўляліся грамадзянамі іншых краінаў, пераважна Расейскай Федэрацыі (Berglund et al., 2004: 97).

Між посткамуністычных парламентараў Літва, у параўнанні з Латвіяй і Эстоніяй, мае найменшую колькасць парламентараў з рускіх мяншыняў (3%). У Эстоніі гэтая лічба сягае 6,1%, а ў Латвіі — 23, %. Аднак мы мусім памятаць, што літоўскі і эстонскі парламенты ўключаюць партыі, якія рэпрэзентуюць этнічныя мяншыні. У латышскім парламенце прадстаўнікі этнічных мяншыняў інтэграваныя ў агульнанацыянальныя палітычныя партыі. Большасць прадстаўнікоў рускай грамады былі палітычна незаангажаваныя за савецкім часам, тады як кожны трэці рускі ў парламенцкіх элітах Літвы, Латвіі і Эстоніі з'яўляецца экс-камуністам. Гэта крыху вышэй, чым сярэдні паказнік супрацоўніцтва з камуністычным рэжымам (меней за 1/3 у Літве і 1/ 4 у Латвіі і Эстоніі; гл. **Табліца 4**).

Аніхто з рускіх (адзінае выключэнне — у Эстоніі) не быў уключаны ў дысідэнцкі рух у савецкі перыяд. Усе дысідэнты — прадстаўнікі тытульнай нацыі, што спраўджвае нацыяналістычны характар палітычнага супрацьстаяння за савецкім часам. Гэта яшчэ раз спраўджвае прадстаўніцтва польскай меншыні ў посткамуністычнай парламенцкай эліце Літвы. Аніхто з іх не быў уключаны ў дысідэнцкі рух, але кожны другі з 17 быў камуністам.

У парламентах прыбалтыйскіх краінаў дэпутаты, належныя да рускай меншыні, страцілі абсалютную перавагу, якой валодалі за камуністычным часам (Misiunas and Taagapera, 1993; Steen, 1997). Тым не менш, насуперак усім прыбалтыйскім «нацыяналізацыйным» высілкам (Duvold, 2006) рускія экс-камуністы здолелі патрапіць ў посткамуністычныя эліты Эстоніі, Латвіі і Літвы. У Польшчы, у адрозненне ад прыбалтыйскай мадэлі, толькі прадстаўнікі этнічных мяншыняў, не датычныя да палітычнай дзейнасці за камуністычным рэжымам, маюць поспех у дэмакратычных выбарах (гл. **Табліца 12**).

Посткамуністычныя парламентары маюць малады век (у параўнанні з дэпутатамі ў «старых» дэмакратычных краінах). Большасці дэпутатаў няма і пяцідзесяці. Сярэдні век парламентара Літвы — 49,6 гадоў, Латвіі — 46,4, Эстоніі — 47,5, а дэпутат Польшчы нават маладзейшы — 45,1. Былыя камуністы сталейшыя векам, чым тыя, што не былі палітычна актыўныя за камунізмам, на 5-6 гадоў у Польшчы і Літве, на 2-3 гады ў Латвіі і Эстоніі. Паколькі ў Прыбалтыцы дысідэнтаў у парламенце мала, то не ўяўляецца магчымым абмяркоўваць іх узроставую структуру дэталёва. Тым не менш, падобна, што ўзроставая мадэль па дысідэнтах перагукваецца з прыбалтыйскай экс-камуністычнай мадэллю (дысідэнты робяцца старэйшымі цягам выбарчых перыядаў і ёсць старэйшымі за раней не залучаных у палітыку людзей). Узроставы фактар у прыбалтыйскіх парламентах, такім чынам,

| Краіна | Раней палітычна неактыўныя | | Удзельнікі савецкай палітыкі | | Удзельнікі дысідэнцкага руху | | Усяго прадстаўнікоў мяншыняў | | Усіх |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | № | % | № | % | № | % | № | % | |
| **Літва** | 9 | 64.3 | 5 | 35.7 | 0 | 0 | 14 | 3.0 | 475 |
| **Латвія** | 61 | 67.7 | 29 | 32.2 | 0 | 0 | 90 | 23.5 | 383 |
| **Эстонія** | 13 | 61.9 | 7 | 33.3 | 1 | 5 | 21 | 6.1 | 342 |
| **Польшча** | 10 | 90.9 | 1 | 9.1 | 0 | 0 | 11 | 0.9 | 1264 |

**Табліца 12.** Парламентары — прадстаўнікі рускай меншыні ў прыбалтыйскіх парламентах і этнічных мяншыняў у Польшчы і іх палітычны досвед за савецкім часам (1990—2004, толькі новыя парламентары).

| Краіна | Раней палітычна неактыўныя | Удзельнікі савецкай палітыкі | Удзельнікі дысідэнцкага руху | Усіх новых парламентараў | Усіх парламентараў |
|---|---|---|---|---|---|
| Літва | 44.9 | 51.2 | 52.7 | 47.1 | 48.3 |
| Латвія | 45.0 | 46.7 | 47.5 | 45.5 | 46.1 |
| Эстонія | 45.1 | 48.6 | 48.8 | 46.3 | 47.7 |
| Польшча | 42.7 | 47.8 | 44.9 | 44.7 | 45.7 |

**Табліца 13.** Сярэдні век парламентараў і іх палітычны досвед за савецкім часам (1990—2004, толькі новыя парламентары).

спрацоўвае на карысць раней не заангажаваных (маладзейшых) людзей. І ўсё ж польская мадэль дазваляе ўбачыць, што экс-дысідэнты цягам усіх вывучаных перыядаў маладзейшыя, чым экс-камуністы, хоць на некалькі гадоў старэйшыя, чым раней не заангажаваныя людзі.

У Польшчы і Літве былыя настаўнікі, прафесары, журналісты, пісьменнікі, публіцысты і выдаўцы найчасцей сустракаюцца між парламетараў-экс-дысідэнтаў (яны складаюць 22,2% ад усіх экс-дысідэнтаў у Літве і 24,5% у Польшчы). Аднак такое прафесійнае мінулае, аўтарытэтна інтэрпрэтаванае як вельмі дапасоўнае для занятку ў будучыні грамадскімі справамі і палітыкай (Best, Cotta, 2002), з нязначнымі выключэннямі ў Літве (тут экс-камуністы ў парламенце з такім прафесійным профілем параўнальна пераважаюць над дысідэнтамі і раней не заангажаванымі), ёсць найбольш тыповым для раней палітычна неактыўных людзей. Між прафесійных катэгорый былых дысідэнтаў найчасцей сустракаюцца мэнеджэры і бізнэсоўцы. У Эстоніі іх 4 альбо 28,6% ад агульнае колькасці дысідэнтаў — 15; у Літве — 5 альбо 31,3%; у Польшчы — 25 альбо 9,3%; у Латвіі — 1 альбо 9,1%. Людзі вольных прафесій і з практыкай юрыстаў: у Эстоніі — 4 альбо 28,6%, у Літве — 2 альбо 12,5%, у Польшчы — 51 альбо 12,7%, у Латвіі — 1 альбо 9,1%. Занятыя ў менш прэстыжных галінах — сельскагаспадарчыя працаўнікі, рыбаловы: у Эстоніі — 3 альбо 21%, у Літве — 3 альбо 18,8%, у Латвіі — 1 альбо 9,1%, у Польшчы — 34 альбо 8,4%.

Цікава тое, што сярод экс-дысідэнтаў у парламентах Латвіі і Польшчы ёсць выхадцы з вышэйшага адміністрацыйнага асяродку (у Латвіі 2 альбо 18,2% і ў Польшчы 29 альбо 10,6%), тады як у Эстоніі і Літве гэтай прафесійнай катэгорыі экс-дысідэнтаў няма. Падобным чынам у Латвіі, Літве і Польшчы некалькі былых дысідэнтаў між посткамуністычных парламентараў былі партыйныя альбо працавалі ў прафсаюзах: у Латвіі — 4 альбо 36,4%, у Літве — 2 альбо 12,5%, у Польшчы — 44 альбо 16,4%. Калі выпадкі Латвіі і Літвы можна разглядаць як рэдкія і звязаныя з асабістымі біяграфіямі, дык выпадак Польшчы сведчыць пра трывалую стваральную ролю прафсаюза «Салідарнасць» у парламенцкіх элітах (гл. **Табліца 13**).

Падсумоўваючы сказанае, варта адзначыць, што гэты агляд сацыяльнай, дэмаграфічнай і прафесійнай структуры парламенцкага корпуса ў Польшчы і трох прыбалтыйскіх краінах паказвае некалькі адметных рысаў экс-камуністаў у параўнанні з экс-дысідэнтамі і тымі, хто раней не быў палітычна заангажаваным. Як меркавалася, жанчыны, маладыя людзі і прадстаўнікі этнічных меншыняў, якія з'яўляюцца парламентарамі ў посткамуністычных парламентах, маюць тэндэнцыю быць, выключна, між раней незаангажаваных людзей. Тыя экс-дысідэнты і экс-камуністы, якія здолелі працягнуць сваю палітычную кар'еру ў посткамуністычных краінах уяўляюць з сябе мужчын сталага веку і з'яўляюцца прадстаўнікамі этнічнай большыні. Як і чакалася, парламентары-экс-камуністы ў парламентах прыбалтыйскіх краінаў маюць пераважна тэхнічную адукацыю альбо валодаюць дыпломам у натуральных навуках. Аднак такая мадэль не выяўленая ў Польшчы. Экс-дысідэнты ў посткамуністычных парламентах з'яўляюцца прадстаўнікамі розных прафесій, што цяжка адлюстраваць ў выпадку прыбалтыйскіх краінаў з-за невялікай колькасці экс-дысідэнтаў.

## IV. Заключная частка

Ва ўсіх чатырох парламентах цягам 4-5 выбарчых перыядаў экс-камуністы і экс-дысідэнты здолелі захаваць сваё існаванне. Самымі паспяховымі тут выявіліся экс-камуністы. Коль-

касць раней не заангажаваных людзей расце, але на гэты працэс істотна ўплывае невычарпальны выбарчы поспех былых камуністаў. У Латвіі і Эстоніі на партыйную сітуацыю ў парламенце (дзе не сфармаваныя левыя) у малой ступені ўплывае фактар прыналежнасці да савецкай эліты. У Польшчы і ў меншай ступені ў Літве на фармаванне партый у парламенце істотна ўплывае савецкае палітычнае мінулае. Польскі парламент пятнаццаць гадоў пасля падзення камуністычнага рэжыму застаецца найбольш палітызаваным са зменлівай доляй экс-камуністаў і экс-дысідэнтаў.

Адносна прысутнасці / адсутнасці былых камуністаў і дысідэнтаў у парламенцкіх элітах прыбалтыйскія краіны дэманструюць розныя мадэлі.

У эстонскім парламенце пік «ачысткі» прыпаў на 1995 год: больш як 80% раней палітычна незаангажаваных парламентараў і паказальна высокі ровень рэкрутавання былых дысідэнтаў (блізу 10% у першых двух парламентах). Дэмакратычная нармалізацыя пачалася з уключэння ўсё большай і большай колькасці былых камуністаў і прыпыненнем прыцягнення былых дысідэнтаў. Сістэма стала менш адчувальнай да негатыўнага палітычнага досведу, набытага за савецкім часам.

У літоўскім парламенце колькасць парламентараў, палітычна незаангажаваных за часам камунізму, узрастае з кожнымі наступнымі выбарамі (з 40 да 80%). Колькасць экс-камуністаў пасля свайго павелічэння ў 1992 годзе трапіла пад сталае зніжэнне, хоць яны (нароўні з экс-дысідэнтамі) захоўваюць значную колькасць месцаў у парламенце. Такім чынам, у літоўскім парламенце пасля адпачаткавай перавагі экс-камуністаў і экс-дысідэнтаў назіраецца сталы сыход і вызваленне ад палітычнага досведу часоў камунізму.

У латышскім парламенце цягам пяці дэмакратычных выбараў колькасць парламентараў без ранейшай палітычнай актыўнасці вырасла (з 60 да 90%). Колькасць экс-камуністаў зменшылася да ўражвальна нізкага роўню (да 8%), а былых дысідэнтаў — да 1%. Латвія — гэта прыклад зболышага запозненага ачышчэння ад пазітыўнага і негатыўнага палітычнага досведу, набытага ў эру камунізму, што прывяло да ўтварэння эліты з «лёгкім палітычным мінулым».

Розныя ступені і несінхроннасць зменаў у посткамуністычных парламенцкіх элітах Літвы, Эстоніі і Латвіі адносна колькасці экс-камуністаў звязана з іх даволі адрознай гісторыяй савецкай наменклатуры і Камуністычнай партыі, а не з асаблівасцямі іх нядаўняга палітычнага развіцця.

Пераклад з англійскай
паводле аўтарскага арыгінала
Вольгі Казакевіч,
друкуецца з ласкавай згоды аўтара.

**Літаратура**


1. Antanaitis Kastytis. Sovietine nomenklatura Lietuvoje, Latvijoje ir Estijoje (1953—1990): bendrybes ir skirtumai: Doctoral dissertation, Vytautas Magnus University. — Kaunas, 2002.
2. Bennich-Bjorkman Li. Tracing the post-communist elite's quality: the cases of Estonia, Latvia and Lithuania // Paper presented at the ECPR Joint Sessions, Granada, Spain, April 14—19, 2005.
3. Berglund Sten, Hellen Thomas, Aarebrot Frank (eds.). Handbook of Political Change in Eastern Europe. Cheltenham, Edward Elgar. 1998.
4. Berglund Sten, Ekman Jan, Aarebrot Frank (eds.). The Handbook of Political Change in Eastern Europe. 2nd edition, Cheltenham, Edward Elgar. 2004.
5. Best Heinrich, Cotta Maurizio. Elite Transformation and Modes of representation since the Mid-nineteenth Century: Some theoretical Considerations // Working paper Eurelite project, 2002. www. nds. rz. uni-jena. de/eurelite.
6. Duvold Kjetil. Making sense of Baltic democracy: public support and political representation in nationalizing states: Doctoral dissertation, Orebro university, 2006.
7. Ekiert Grzegorz, Hanson Stephen (eds.). Capitalism and Democracy in Central and Eastern Europe. Assessing the legacy of communist rule. — Cambridge: Cambridge university press, 2003.
8. Gaidys Vladas. Socialiniai politiniai prpcesai, Praeities ir dabarties vertinimas, ateities lukesciai // Lazutka Romas, Matulionis Arvydas, Stankuniene Vlada (eds.). Lietuva Europos Sajungoje. Pirmieji metai, Vilnius: Socialiniu tyrimu institutas, 2005.
9. Gallagher Michael, Laver Michael and Peter Mair (eds.). Representative Government in Modern Europe. Institutions, Parties and Governments. — New York: McGraw Hill, 2001.
10. Gryzmala-Busse Anna. Redeeming the communist past. The regeneration of communist parties in East Central Europe. — Cambridge: Cambridge university press, 2002.
11. Kitschelt Herbert, Mansfeldova Zdenka, Markowski Radoslaw, Toka Gabor. Post-communist party systems. Competition, representation and inter-party cooperation. — Cambridge: Cambridge university press, 1999.

12. Krupavicius Algis. Models of post-communist political elites in Central Europe and the Baltics: comparative analysis, Hungarian center for democracy studies. Budapest, 1998, no 158.
13. Lieven Anatol. The Baltic revolution. Estonia, Latvia and Lithuania and the path to independence. — New Haven and London: Yale university press, 1993.
14. Matonyte Irmina and Mink Georges. «From nomenklatura to competitive elites: communist and post-communist elites» // Berglund Sten, Duvold Kjetil (eds.). Baltic democracy at the crossroads. An elite perspective. Norwegian academic press, 2003.
15. Matonyte Irmina. Women MPs in the Lithuanian Seimas 2005: still hostages of the masculine parliamentary tradition and organizational culture?// Paper presented at the international conference «Enlivening Democracy. Building pluralism from the Bottom», Warsaw, December 8—10, 2005 at the IPS.
16. Mink Georges and Szurek Jean-Charles. La grande conversion: le destin des communists en Europe de l'Est. — Paris: Editions du Seuil, 1999.
17. Misiunas Romuald, Taagepera Rein. The Baltic States. Years of Dependence 1940-1990. — London: Hurst and Company, 1993.
18. Pettai Vello, Kreuzer Marcus. Party politics in the Baltic states: social bases and institutional contexts // East European Politics and Societies, 1999, vol. 13, no 1.
19. Staniszkis Jadwiga. The dynamics of breakthrough in Eastern Europe: the Polish experience. — Berkley: California university press, 1991.
20. Steen Anton. The new elites in the Baltic states: re-circulation and change // Scandinavian political studies, 1997, vol. 20, no 1.
21. Wasilewski Jacek and Wnuk-Lipinski Edmund. Poland: winding road from the communist to the post-Solidarity elite // Theory and Society, 1995, no 24.